Цэна асобнаго нумэру 5 кап

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія тольк для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 2 Кастрычніка 1914 г. № 39

## Наша павіннасьць.

Шырэй і шырэй разліваецца пажар вайны. Агортывае аграмадные абшары—ад Парыжа да Варшавы, ад Бальційскаго мора на палудзень аж-но пад Чорнае.

Чырванее земля, чырванее небо. Гул стрэлоў гарматніх коціцца с краю да краю — праз гарады і вёскі. Будзіць у сэрцах людзкіх страх, у іншых—гнеў, злосьць, ненавісьць. Жаль зменяе радасьць, сьмех спыняюць сьлёзы...

Многа страт, многа гора ўсюды. Шкода тых што ў вайне галавой налажылі. Цяжка і астаўшымся ў хаці. Але пройдзе вайна, мінецца ўсё благое, што нясе яна нам с сабою. Скрозь дым пажароў, што нішчаць багацьця народу,— сьвеціць вечным сьветам сваім *надзея.*

Надзея на лепшую будучыну, на новае жыцьцё.

Але гэта жыцьцё мы самі—сваімі рукамі — павінны тварыць. Мы ўсе, хто астаўся дома павінны спаўняць спакойна свае грамадзкіе павіннасьці.—спаўняць іх болей шчыра болей рупна, чым дагэтуль: бо нас цяпер меньш, бо мы заступаемо і тых, хто праліваe сваю кроў на палёх бітвоў.

Жыцьцё не спыняецца ні на адзін момэнт, і ні на адзін момэнт не павінны мы спыняць сваей грамадзкай работы: іначэй жыцьцё адойдзе ад нас далёка ўпярод, і мы не пасьпеем за агульным поступам.

Прыйдзе пара, калі змоўкнуць гарматы, і рукі, што цяпер дзержуць вінтоўкі, возьмуцца ізноў за саху. Ніхай жэ, вярнуўшыся да родных ніў і хат, нашы браты знойдуць усюды добры лад і парадак. Мы павінны прыгатаваць для іх страву і для цела і для душы. Для душы ешчэ болей, чым для цела: тут, дома, яны пасьля змаганьня не на жыцьцё, а на сьмерць, павінны знайсьці шчырую *любоў дратнюю, міласьць да чэлавека.* На любві, на міласьці будзем мы будаваць нашу будучыну, каб гнеў і ненавісьць, што будзяцца у часі крывавай бітвы не запанавалі у сэрцы нашым назаўсягды, каб с крывавым туманам разьвеяй іх вецер да званьня

Памятайма, браты, каб нашы палеткі былі засеяны добрым зярном, а ў домах і ў сэрцах каб узрасьлі і закрасавалі добрые, сьветлые думкі!

а—н—а.

— —

# ВАЙНА.

### Расейска-Аўстрыяцкая.

З гэтаго тэатру вайны за апошні час весткі даходзяць вельмі скупа. Гэта тлумачыцца тым, што расейцы, с прычыны нямецкай падмогі аўстрыякам, заняты цяпер новымі перэмяшчэньнямі свайго войска, а ваенная тактыка вымагае вялікай у гэтым таёмнасьці, каб часам з лішніх гутарак не скарыстаў праціўнік. Апошніе афіціальные весткі такіе: 24 верэсьня. У Карпатах на захад ад рэчкі Санок разбіты аўстрыяцкі атрад; узята кулямёты і палонные. У Соліве, ў 20 верстах ад гораду Мункача, захоплена намі парк і немалы абоз. 25 верэсьня. Барацьба з гарнізонам Перэмышля складаецца карысна. 28 верэсьня. У Галіціі аўстрыяцкае войска зграмаджываецца у розных напрамках. Ня гледзючы на вельмі асцярожны характар іх пастуканьня, нашай конніцы блізка Яворніка удалося раптоўна абстрэляць перакрэсным агнём аўстрыяцкую дывізію, ідучую у паходным парадку, і разсеяць не малую яе часць. 28 верэсьня. Нашы кавалерыйскіе атрады (конніца), перайшоўшы у некаторых пунктах Карпаты, ўтаргнуліся ў Вэнгерскую раўніну.

### Расейска Нямецкая.

На гэтым фронце праз увесь час ішлі заўзятые і крывавые бітвы. Немцы атступалі, а расейцы з боем напіралі. Пры атступаньні немцоў такіе адбываліся бітвы, як ведама з афіціальных вестак: 23 верэсьня. Бліжэйшые жалезна-дарожные станціі у Усходней Прусіі запханы поездамі. Атступаючый у Прусію праціўнік атрымаў падмогу ад гарнізону Кэніксбэргу. Умацаваные пазыціі на граніцы падтрымліваюцца агнём многачысьленнай цяжкай артылеры Наша наступаньне не спыняецца. Асабліва гарачые бітвы адбываюцца у ваколіцах Бакалажэво. 24 верэсьня. Атрымаўшы падмогу з гарнізону Кэніксбэргу немцы не перэстаюць на фронце ад Владыслaвова да Рачкі упорна затрымлівацца, карыстаючыся азёрнымі праходамі і балотамі. За Віслай стычкі пярэдніх атрадоў адбываліся у раёне Опатов—Сандомір. Бітвы 24 верэсьня адбываліся з неўбываючым упорствам. Атакі сьвежых нямецкіх сіл ад Вежбалова да Філіппова адбіты з немалымі для іх стратамі. Вёска Каменка каля Бакалажэва захоплена расейцамі ночным штурмам, пры чым узята некольki нямецкіх арудзій. У лесе Масальшчызна, болей на захад Рачкі, наша войска ночай абхапіла непрыяцельскі атрад, часьць яго знiстожыўшы, а часьць разсеяўшы. Тут былі захоплены кулемёты. Узята г. Бяла. 25 верэсьня расейцы не перэставалі адпіраць непрыяцеля, разьбіўшагося на дзьве группы; адна з іх знайходзілася у раёне Владыслaвова і Вежбалова; расейцы выбілі яе з Владыслaвова, абхапілі с поўначы, але 25 верэсьня яна ешчэ утрымлівалася на пазыціях к усходу і паўдню ад Вежбалова Проба перахода ею тутака у наступленьне адбіта з вялікімі для яе стратамі. Другая непрыяцельская група, відочна, не малой сілы, заўзята вела бітву у раёне возера Ганча-Бакалажэво. К раніцы 25 верэсьня, расейцы абхапілі абодва яе крыльля і адначасьне пачалі безаглядную наступаньне на фронт, карысна штурмуючы адну за адной займаные праціўнікам пазыціі. Лык заняты расейцамі. Наступаньне на ўсім фронце не спыняецца. 26 верэсьня. Бітвы ідуць з неспыняным упорствам. Отступаючае ад Лыка нямецкае войска ўзрывае масты. У раёне між Івангорадам і Сандомірам у некаторых пунктах ідзе артылерыйская перастрэлка с праціўнікам, падыйшоўшым к Віслe. 27 верэсьня пярэднімі атрадамі расейскай кавалерыі былі атакованы і знiстожэны нямецкіе раз'езды. Часьць немцоў была пасечэна, часьць узята у палон, прычым, даляцеўшый першым да непрыяцеля Яго Высокасць князь Олег Констанцінавіч ранены у нагу. 28 верэсьня на левым беразе Віслы, на шляхах х Івангораду і Варшаве пачаліся бітвы. У рэшці без перамен.

Раненый у бітве з немцамі Яго Высокасць Князь Олег Констанцінавіч і прывезены 28 верэсьня с поля бітвы у Вільню, пасьля апэрацiі, 29 верэсьня, ціха сканаў.

### Француска-Англiцка-Нямецкая.

Каторы тыдзень ідзе ужо тут крывавае змаганьне на жыцьцё і сьмерць паміж хаўрусьнікамі і і немцамі. Глаўная бітва як і ўперад ссерадковываецца на левым францускім крыле. Стараючыся абыйсці у гэтым мейсцы нямецкую армію генера Клука, французы не нерэставалі выцягіваць свой фронт усё далей па напрамку к бэльгійскай граніцы і к мору. Немцы на гэта атказалі падвозкай к свайму праваму крылу усё новых і новых падмогаў. 23 верэсьня. Між Соммой і Уазой французкае войска ў некаторых мейсцох пасунулося наперад, атступіўшы ў некаторых іншых пунктах. У аколіцах Лясіны немцы пайшлі у заўзятую атаку, якая аднак ім не ўдалася. На правым берагу рэкі Эн к поўначы ад Суасона, хаўруснае войска крыху пасунулася наперад. 24 верэсьня. На левым крыле на поўнач ад Уазы бітвы разгараліся з узрастаючай сілай. У раёне на поўнач ад Мааса французы троху пасунуліся на перад. Нямецкіе атакі на абодвы крылы хаўруснаго войска адбіты. Уступленные перад гэтым пазыціі між Шон і Руа заняты ізноў французамі. 26 верэсьня. Бітва ішла на лініі, пераходзячэй цераз раёны Лянса--Арраса—Брэйсюрсомль—Шона—Руа — Лясіны. У цэнтры між Уазой і Маасом адбываліся аддзельные стычкі. У Вэвры артылерыйская бітва на ўсім фронце. 27 верэсьня. Уся лінія боевога фронту утрымана французамі, ня гледзючы на заўзятые атакі праціўніка. Немцы пайшлі былі у заўзятую атаку на левым беразі Анкра, але карысьці ня мелі. У Вэвры немцы кідаліся у заўзятые атакі ў раёне Апрэмон ночай на 27 верэсьня, пры чым Апрэмон двойчы пераходзіў з рук у рукі і астаўся за французамі. 28 верэсьня. Палажэньне астаецца, як і было. У Лясіны французы захапілі нямецкае знамя. 29 верэсьня. Між Аррасом і Уазою французы адбілі некольки атак праціўніка У цэнтры французы трохі пасунуліся наперад. На правым крыле французы адбілі ночную атаку немцоў.

### Бэльгійска-Нямецкая.

Пасьля заўзятых і кравапраліўных бітвоў, немцы здабылі крэпасьць Антвэрпэн, дзе выехаўшы с сталіцы запёршыся былі кароль, урад і бэльгійскае войска. Антварпэн быў заняты немцамі ночай на 27 верэсьня. Крэпасное войска бэльгійцоў, бачучы, што далей змагацца немагчыма, пакінула крэпасьць, каб далей змагацца у атрытым полі, і скіравалася к сваей прыморской крэпасьці Остэндэ, куды ешчэ раней пераехаў урад. Часьць нямецкаго войска кінулася на перарэз бэльгійцам, каб захапіць іх на гэтай дарозе. Як гэта немцам удасца—ешчэ німа ведама. З усяго тольki відаць, што немцы бадай саўсім змаглі геройскіх бэльгійцоў. Антварпэн быў узяты пасьля 14 дзённай заўзятай абароны. У абароне памагала бэльгійцам 8000 англiцкаго марскога войска. Ёсьць весткі, што глаўные англiцкіе і бэльгійскіе сілы разам з бэльгійскім каралём шчасьліва дабраліся да Остэндэ.

### Японска Нямецкая.

Японцы далей аблегаюць крэпасьць Ціндао. Японскіе авіаторы (лятуны) другі дзень кідаюць у крэпасьць бомбы. З мора Ціндао абстрэліваець англiцкі броненосец. Палажэньне крэпасьці бяз выхаду.

### Сэрбска-Чэрнагорска-Аўстрыяцкая.

Сэрбы і чэрнагорцы цяперака ужо супольна ваюць проці аўстрыякоў. Войска хаўрусьнікоў энэргічна наступае на Сараева. Каля Каліноўкі чэрнагорцы вытрымалі самую найвялікшую бітву ад часу абвешчэньня вайны. 10,000 аўстрыяцкаго войска хацела перэрваць лінію чэрнагорцоў акружаючых Сараево, каб ачысьціць сабе дарогу у гэты горад. Але пасьля заўзятых атак аўстрыяцкаго войска былі атбіты чэрнагорцамі і змусілі аўстрыякоў, з вялікімі стратамі у людзях і аружжы, атступіць назад у Каліноўку. У бітвах 26 і 27 верэсьня пад Сараевом каля Гоманьі чэрнагорцы узялі шмат палонных, кулемётоў, гарматоў і ваенных прыпасоў. Сэрбы дружна памагаюць чэрнагорцам у гэтым дзелі. 26 верэсьня сэрбы карысна змагаліся у Босьніі і захапілі некольki кулемётоў.

———

### Вайна на моры.

Пасьля марскіх бітваў 27 і 28 верэсьня трох расейскіх крэйсероў з нямецкімі падводнымі лодкамі, адзін расейскі крэйсер «Паллада» затануў з усей сваей камандай. На Бальтыцкім моры ў старане Дагерохта снуюць нямецкіе ваенные параходы. Часьць англiцка-францускаго флоту, дзействуючаго у Адрыатыцкім моры, аддзялілася і паплыла, як паведамляюць немцы, у Індыйскі акіян. Нямецкі мінаносец захапіў у Паўночным моры плывучый з Англіі у Расею нарвэжскі параход, на якім знайходзілася каля 110 тыс. пудоў каменнаго вуглю. У Філядэльфіі затрымана два норвэжскіе параходы з вуглём прызначэным для Нямеччыны.

### Вайна у паветры.

Над парыжам лётаў і кідаў бомбы нямецкі самалёт, забіўшы гэтак у горадзе 4 і раніўшы 20

чэлавек. Англіцкі лятун бомбамі кіданымі с самалёту зністажыў нямецкі дзірыжабль (асабліва самалёт) у Дюссэльдорфе. Каб даканаць гэтаго, англіцкі лятун павінен быў праляцець 100 міль над Нямецкай зямлёй. Лятун меў с сабою двух памоцнікоў. Чэрнагорцы падстрэлілі аўстрыяцкі аэроплан, каторы пасьля гэтаго зваліўся у морэ.

---

У **Португаліі**. Спадзяюцца што хутка Португалія абвесьціць вайну Нямэччыне. Португальскае войска будзе атпраўлена на французскі фронт.

У **Люксэмбургу** Герцогіня (княгіня) Люксэмбурская і 250 чэлавек яе войска выселена у Нямеччыну. Немцы заплацілі Люксэмбургу 4,000,000 марок за прычыненые імі шкоды у часе перэправы свайго войска цераз гэта княжства.

У **Румыніі**. 28 верэсьня раптоўна памёр румынскі кароль Карл. Пасад румынскі заняў сын памёршаго прынц (князь) Фэрдынанд. Памёршы кароль быў праціўнікам зьліжэньня Румыніі з Расеей. Нема ведама толькі, якой сьцежкай пойдзе яго насьледнік.

У **Болгарыі** Усе болгарскіе афіцэры, пражываючые у Швэйцарыі і Італіі, хутка вызываюцца на бацькоўшчыну. На болгарска-турэцкай граніцы паміж болгарамі і туркамі была стычка, у якой не мала з абядзьвух старон забіта і ранена.

У **Турціі** далей ідуць па ўсіх напрамках ваенные прыгатаўленьня. Англіцкім і італьянскім параходам загадалі іх урады пакінуць турэцкіе прыстані на Чорным і Мраморным морах.

У **Пэрсіі**. Пэрсідзкі урад зьвярнуўся к Расеі с просьбай вывесьці з граніцаў Пэрсіі сваё войска, ссылаючыся на тое, што ў праціўным разе Турэччына можэ абвесьціць вайну Пэрсіі. Расейскі урад на гэта не прыстаў с тэй прычыны, што гандлёвые, палітычные і экономічные інтэрэсы Расеі вымагаюць ваеннай расейскай ахраны на пэрсідзкай зямлі. Курды, якіе нападалі на расейскіе казацкіе атрады, пасьля неўдачаў, трохі прыціхлі.

## Каля вайны.

### Бітва на Нёмане.

Ковенская „Літ. Русь“ апісывае бітву ў м. Срэдніках, калі расейскае войска заняло лепшые пазыціі на правым беразі Нёмана. Каля 12-тай гадзіны пачалі гаварыць, што непрыяцельскіе агромные сілы ўжо блізка і гэўне даганяць расейскае войска пры пераправе; а 3-й гадзіне на левым беразі пачалася перастрэлка, а праз гадзіну бітва зграмадзілася на самым Нёмане, пры ўплыве ў яго рэчкі Дубіссы: с правага берэгу с крутых гор дзіка вылі далёкабойные гаубіцы і цэльнасьцю сваей крышылі непрыяцеля, не пазваляючы яму стаяць на адным мейсцы; пад гарой на прыберэжных пяскох працавала палёвая артылерыя, а ў перадзі яе пад аслонай гарматняго агню на другой старане рэкі, пяхота храбра адбівала непрыяцельскіе сілы, каторые стараліся якколечы прабрацца да берэгу. Бітва цягнулася ўсю ноч аж да світаньня. Сярод стрэльбавога трэску, які зьліваўся у адно з гарматнім гулам, сярод выцьця куль, чуваць было раз у раз расейскае „ура“ — гэта нашы кідаліся ў штыкі. Заняўшыеся ад артылерыйскаго агню пажары, асьвечалі поле бітвы, і с прыбярэжных прыгоркаў усё было відаць, як на далоні. Пры сьвітаньні бітва пачала паволі сціхаць, урэшці усё замёрла, толькі адзіночные стрэльбавые трэскі успаміналі аб страшэнным здарэньні. Немцы стрэляюць кепска;—іх артылерыйскіе набоі большую палавіну часу рабілі вялікі пералёт і былі зусім нешкадлівые для расейскаго войска; праўда, набояў немцы не шкадавалі, — кулі іх у паветры безупыньня гудзелі і грымелі якімсці басавым звінючым тонам. Раніцай немцы уцяклі, не аглядаючыся, аставіўшы на полі бітвы горы нябошчыкаў, набояў, разбітых павозак, аўтамабілёў, мотоцыклетак; ў тую нешчасную для іх ноч яны страцілі тры сьцягі (знамёны), многа аружжа і пяць палкоў. Усё гэта дасталося расейскаму войску.

...Выглянула сьветлае ранняе сонцэ, пазалапіла сваімі праменямі хвалі Нёману; лес не шэлесьцеў сваей ужо пачынаючэй жаўцець ліствой, і толькі выцьцё сабак ды чорные хмары галак насіліся над полем бітвы і сваімі жуткімі крыкамі муцілі цішыню. Горы нямецкіх трупоў лежалі раскіданые ў безпарадку на полі; іх было так шмат, што расейцы праз тры дні не пасьпелі пахаваць іх.

### Бітва каля вёскі В.

У харкоўскай газэці „Утро“ так апісываецца гэта бітва:

Вёска В... у будучай гісторыі аўстрыяцка-расейскай вайны, займець не апошняе мейсца. Улезшы клінам у разклад аўстрыякоў, яна цэлых 7 дзён была полем страшэннаго змаганьня... На яе лілося морэ агню. Пачынаючы ад стрэльбоў і кончучы на цяжкіх вялікіх гарматах—усё гэта бухало на яе с сваіх распаленых жорлаў смяротным агнём праз увесь гэты час.—Яе забіралі па некольки разоў адзін у аднаго, то расейцы то аўстрыякі, штыкавым боем. Фабрыка тарпатыны была мейсцам апошняго спакою не адной сотні ахвяр. Укруг заводу йшла каменная сьцена, якая і памагала у абароне. Сьцягалі сюды ўсё: цзьверы, бочкі, доскі; з унутрэнняй стараны прыстроілі памост, а з яго праз верх ішла стрэльбавая перэпалка... Прад сьцяной расцягнулася поле, а ў шагоў сотні ад яго пачынаецца лес. Адгэтуль вось і вялася гэтая адзічэлая атака— тут і кіпела бітва. Усё поле між лесам і сьцяной было паарана кулямі і пакрытае кавалкамі шрапнэлі. Не было цэлай ні аднэй пядзі зямлі. Здавалося, што гэтая мясьпіна павінна быць граніцай сьмерці. Але, людзі йшлі; наміралі адны — за імі йшлі другіе. і завод і лес раз-у-раз пераходзілі з рук у рукі. Берэг апошняго яшчэ і цяпер носіць сьляды гэтых недаўных атак. А далей... новые трупы і новые вобразы спусташэньня.

### З запісной кніжкі збітаго баварца.

Француская артылерыя абстрэліваець нас страшэнным агнём. Хаця мы пастараліся зрабіць нашы пазыціі недаступнымі, але ўсё-ж такі мы ўжо прымушэны атступаць і ратаваць знамёны. У пацёмках мы капаем новые траншэі (акопы) у 50 сантымэтроў (каля 12 вершкоў) глыбіні, пад сьмяротным агнём французоў. З гэтай прычыны наша артылерыя шмат слабей працуе. Раніца. Францускіе аэропляны неатступна агледаюць нашы пазыціі. Мы сядзім у траншэях. Наш атрад на мосце меў вялікіе страты: ад 160 чэлавек асталося толькі 25. У траншэях мы прамоклі да касьцей. Ня можна вытрываць запаху трупоў. Есьці выпадаець толькі адзін раз, па 11 гадзіне у ночы. Усю ноч мы кудысьці ідзём. Начальство кажэ, што мы „робім пераход“. К ліху ўсе умоўные фразы: мы проста-на-проста бяжым. Натта есьці хочэцца, але есьці німа чаго. Дождж ліець, як з ведра. Зноў капаем траншэі, зноў німа аддухі: трэба цягаць зямлю. Над галавой разрываюцца шрапнэлі. Пралетаець новы францускі аэроплян разгледаючы нашы пазыціі. Пасьля гэтаго французы ідуць у шалёную атаку. Нас зноў засыпаюць бомбамі...

### Нямецкіе сілы.

Петраградзкая ваенная газэта „Русскій Інвалід“ у № 207 так аблічае ваенную сілу Нямеччыны:

Агульная лічба нямецкаго войска раўнялася 4,500.000 людзей, ня кепска вымуштрованых у ваенным дзелі. Пры гэтым у спакойным часе стаяло пад броней 600,000, запасных 3,100,000 і ратнікоў апалчэньня 800,000. На першую лінію немцы выставілі 25 корпусоў і 11 асобных дывізій конніцы лікам усяго 1.300 000 палявога войска. Войска гэта як падлічываюць самі немцы, мела страты ня меней як 400—500 тысяч, пры чым лічба гэта на думку „Русск. Інв.“, вельмі нямецкім урадам зьменьшана, і скарэй за ўсё бітвы і хваробы пазбавілі немцоў 1,025,000 людзей. Для другой боевой лініі немцы зграмадзілі ешчэ 25 корпусоў на агульную лічбу 1,816 000 людзей. Цяперака, адлічыўшы забітых, раненых і хворых, немцы на думку „Русск. Інв.“ маюць 5.291.000 душ войска, з якога $^{3}/_{4}$ часьці ваюе на бэльгійска-францускім тэатры вайны, а рэшта стаіць на ўсходнім фронце.

Дабавім ад сябе, што адносіны гэтых частак троху зьмяніліся, бо, як ведама з афіцыальных вестак, не мала войска за апошніе тыдні немцы перакінулі з заходняго на ўсходні тэатр вайны.

## Песьні Вайны.

Вазьмі, маці, пяску жменю,
Пасей, маці, на каменю;
Як прыжджэшся с пяску ўсходу,
Тады верне сын с паходу.

(З народнай песьні).

---

### I. Варожбы.

На ўзбярэжжы, над рэкою
Шэпчуць вербы з асакою:
—Што-то будзе, што-то будзе?
Штось трывожны сьвет і людзі.
　На зямлі пашлі пажары,
　Небо дымюць дыму хмары,
　Там і тутака агнішчэ,
　Над агнішчэм вецер сьвішчэ.
Па сялібах—пошэсць хваляй...
Гэты хвор, таго схавалі,
Тому чэшуць дамавіну..
Жыці, мерці німа ўпыну.
　А па небе ў гэта лета
　Ходзіць ходырам камэта,—
　Хвост яе—не дай Ты, Божэ!..
　На дабро нам не варожэ.
Далей, вокал—як магіла...
Сочцэ круг свой зацямніла:

## Летапісцы*).

---

Але дзед ужо забыўся, што раней дыктаваў, а тут яму хочэцца выгаварыцца, выліць тое, што накіпело на душы. Ен чуе, што мусіць гэта рабіць, хоць пірад кім небудзь, тады можэ палягчэе...

— Ага! ага! — пачынае ён далей: во, за язык якбы хто пацягнуў, — дзяры лыкі калі дзяруцца «А учора нявестка гэтак піргнула мяне ад стала, ажна старые костачкі мае чуць не разсыпаліся... Яна называла мяне гультаём: як гэта кажуць, быў конь ды з'езджыўся... А тапчан гэты я майстраваў, а стол гэты хто рабіў, калі не я?.. куды ня кінь — ўсё клін». Дзед доўга кашляў. «Што мне робіць? торбу надзець і пайсьці жэбраваць хіба, дык не па Юрку шапка, казаў той.. Ой, жыцьцё ты маё! А якбы наумысня во жыву.. Ты на гару, а чорт за нагу... Чаму Ты, Божухна, сьмерць збавіцельку мне ня шлеш? Калі топішся, то за брытву хопішся, казаў той“...

Дзед зноў закашляў...

Якую долю чэлавек у Бога просіць, гэтаж грэх прасіць гібель..

З яго мутных вачэй пасыпаліся сьлёзы, як боб.. Дзеду, пачуўшы сьлёзы на сваім высахшым твары, зрабілася вельмі жаласна і ён заплакаў, ціха, глухім голасам, і мямліў бяззуб'ім ротам, якбы хлёбнуўшы гарачэй вады...

Гэтак прайшло колькі хвіль і дзеду палягчэла, як бы тое цьвёрдае і калючэе, што стаяло ражаном папярок у горле, пайшло. унутро. Ен закурыў люльку, паправіў лучыну і прысеў на тапчан.

Андрэйка зьбіўся с панталыку, дый спаць яму хацелася і ня мог ён парадкам у дзеда дабіцца, што пісаць.

— Дык кажы, дзядок, што пісаць? — пытаўся Андрэйка і зеваў.

— Пішы, каток, пішы!—ажна строга казаў дзед: «Кажуць людзі: у людзей пытай і свой розум май, а гаспадарку яна, ведзьма, вядзець, дык толькі крый Ты Божэ! як гэта кажуць: сабакам сена касіць». Дзед пачаў на пальцах лічыць: «Буланка здохла, кароўка чуць ногі валочыць, а сено пагніло. Калі я ей што кажу, дык яна толькі адгарківаецца, як благая сучка, хоць ты перад ею макам разсыпайся не памагае!.. А я табакі не магу дастаць.. А ці ўбачымся мы ўжо с табою?.. Далей вочы лягчэй сэрцу, казаў той... Я ўсё слабею, сынок ты мой.. земля матуля да сябе завець... Хто мне вочы прыплюсьніць? А хто хаўтуры па людзку ладзіць будзе? А хто сьвечку паставіць за душу маю грэшную? А круці не вярці – трэ' пэмерці»...

Дзед змоўк і трос сваей лысай белай галавой. Матыль скульсці ўзяўся і паляцеў на агонь. Андрэйка заглянуўся на яго. Палажыў ручку, каторай пісаў і давай лавіць матыля.

Імпэт вырастаў у яго с кожным новым выкрутасам над матылём, як у чыстакроўнаго паляўнічаго. Вось Андрэйка злавіў матыля, але той спрытна вылізнуў с паміж яго пальцоў, аставіўшы нейкі слізкі пылок Андрэй болей не гнаўся за ім і матыль давай зноў кружыцца, як шалёны, над агнём. Андрэй так пазіраў на яго доўга, доўга, пакуль вочы якбы алавяные зрабіліся, затуманіліся, разнаколерные кругі паказаліся над дзедам. Андрэй заплюшчыў вочы, дзед зрабіўся маленечкім, усё злілося—сплылося разам і... ён заснуў, зрабіўшы другую, яшчэ большую, чорную «булку» на паперы.

Доўга думаў дзед. Але каб хто спытаўся у яго, што ён думае, дык ён бы ня ведаў што атказаць. Усё у старых грудзёх перэмяшалося, як бы хто там віламі жалезнымі перэвярнуў ўсё да гары нагамі... Нешта там балело... нешта шчаміло...

«Заяц мне дарогу перабег, — казаў дзед і заківаў галавой,—здаецца я нічога кепскаго на сьвеці не зрабіў... Не капціў небо, не псаваў хлеб, казаў той». Пішы, Андрэйка, пішы!

А тымчасам Андрэйка яшчэ мацней захрапеў. Котка вылезла с пад прыпечка. Нясьмела і ціха падыйшла яна да стала, скокнула на тапчан і, бліснуўшы сваімі вачыма, прытулілася да Андрэйкі, зьвярнуўшыся клубком.

---

*) Гл. № 38.

